І.М. МАЛАШУК

# ГЕНЭЗІС ПАКЛАНЕННЯ СОНЦУ Ў СВЕТАПОГЛЯДЗЕ БЕЛАРУСАЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЯСЕННЯЙ АБРАДНАСЦІ)

Паходжанне каляндарных і сямейна-бытавых абрадаў і цыклаў песень, што спадарожнічалі ім, бясспрэчна, адносіцца да глыбокай старажытнасці, да таго часу, калі першабытны чалавек розныя сілы і з'явы прыроды адухаўляў і імкнуўся, як яму здавалася, уступаць у непасрэдныя зносіны з імі. Не здзіўляе, што даследчыкі ў абрадах і абрадавых песнях заканамерна бачаць адлюстраванне стварэння Сусвету, адгалосак першабытнага светапогляду. Першапродкамі асабліва шанавалася сонца: "сонца — гэта "цар неба", "божае вогнішча" (бог агню). На сонца, як на боства, нельга было злавацца, здзяйсняць адносна яго нешта непрыстойнае... Сонца з'яўлялася актыўным станоўчым пачаткам адносна чалавека: да яго звярталіся з просьбай аб здароўі і дабрабыце" [1, *444*]. Асабліва яскрава гэта прасочваецца ў вясенняй абраднасці.

Да цяперашняга часу з вясной звязваюць цэлы шэраг паўязычніцкіх свят. Е.М. Раманаў адзначаў: "Першага сакавіка лічыцца пачаткам вясны. У гэты дзень сяляне працуюць, каб не гнявіць мучаніцу Аўдакію, якая "дзержа ў руцэ лета". Натуральна бачыць у гэтым адгалосак таго часу, калі год пачынаўся першага сакавіка" [2, *142*]. "У рускіх Уладзімірскай губерні ў дзень першага сакавіка было прынята "сустракаць вясну". Для гэтага... прыносяць з лесу сукі, якімі паляць у печы, *каб вясна была цёплая.* У Куйбышаўскім раёне Калужскай губерні нават быў вядомы асаблівы абрад "грэць вясну", які заключаўся ў запальванні рытуальных вогнішчаў у дзень Сарака мучанікаў ці на Благавешчанне... У шэрагу вёсак вогнішчы, якімі "грэлі вясну", не проста палілі ў полі, але і сплаўлялі, пускалі іх па рацэ".

Больш папулярнымі падобныя формы былі на Карпатах і на ўсходзе Балкан. Так, у румын сербскага Банату ў дзень Сарака мучаўнікаў жыхары палілі вогнішчы з двух бакоў сяла, пераскоквалі праз іх і крычалі: "Вылазь, цяпло, перамажы зіму". У балгар Банату напярэдадні першага сакавіка і затым яшчэ 12 дзён запар палілі вогнішчы і гаварылі: " *грейми Марта*" (давайце грэць бабу Марту) і прыгаворвалі пры гэтым: "Баб' Марто, я тебе грея днес, ти мене утре!" (Баба Марта, сягоння я грэю цябе, а ты мяне заўтра!). У Странджы першага сакавіка жанчыны, імкнучыся пазбавіцца ад шэраню, небяспечнага для дрэў, якія расцвілі, перад узыходам сонца вылівалі на двары кацялок з варам, гаворачы: "Баба Марта да попари сланата!" (Няхай Баба Марта апарыць шэрань!)" [3, *111*].

Саграванню зямлі маглі садзейнічаць і некаторыя рытуальныя дзеянні. У розных мясцовасцях Балгарыі на Благавешчанне, у дзень святога Трыфана і другія веснавыя святы жанчыны выносілі ў сад гарачае вуголле і запальвалі анучы, саграваючы такім чынам зямлю.

Акадэмік Я. Карскі лічыў пачаткам вясны свята Дабравешчання (25 сакавіка па старому стылю) [4, *251*]. Несумненна, што такое меркаванне мела рацыю: у адной з песень веснавога цыклу знаходзім: "Дабравешчанніко святое, Пашлі сонейка залатое, Каб зямелька адышла, Да вясна да нас прыйшла..." [5, *121*]. Як бачым, тут сонца "адмыкае зямлю" ад працяглага зімовага сну. Адчуваецца, што менавіта архетып сонца знаходзіўся ў самым цэнтры ўсіх гэтых урачыстасцей. Надыходзіў час яго актыўнага гаспадарання, якое не перарывалася на працягу ўсяго цёплага перыяду: "Вясна — маці, а лета — бацька" [6, *88*]. Адмысловая сувязь вясны з летам прасочваецца і ў веснавых песнях: "Завілася пчолка над ва-

*Ірына Мікалаеўна МАЛАШУК, аспірантка ІМЭФ НАН Беларусі, ст. выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Бабруйскага філіяла БДЭУ.*

ратмі. Красна сонца заіграла над людзьмі. Што ж ты, вясна наша красна, прынясла? Прынясла я цёпла лета дзеля вас" [5, *122*]. Як бачна, сонца і вясна надзяляюцца адным эпітэтам, які "сустракаецца не часта, звычайна ў найбольш застылых, "акамянелых" спалучэннях: *краснае сонца, красна дзеўка, вясна красна*. Прычыну гэтага трэба бачыць перш за ўсё ў тым, што "актыўны" ў старабеларускай мове прыметнік *красны* з сучаснай жывой мовы выпаў, стаў архаізмам, захаваўшыся толькі ў традыцыйным фальклоры, у яго найбольш старажытных пластах..." [7, *25*].

Абрад "гукання вясны" меў выразныя аграрна-магічныя рысы. Трэба думаць, што вяснянкам надавалася ў ранневеснавы перыяд такая вялікая ўвага менавіта як песням абрадавага значэння, закліканым магічна наблізіць цёплыя дні, адраджэнне прыроды і магчымасць правядзення палявых работ. Паўторымся, паколькі асноўнай прыроднай сілай, якая мела жыватворны пачатак, было сонца, менавіта яму і адводзіцца вядучае месца ў песнях веснавога цыклу: "Вясна прыдзе Ой, да скора к нам, эх да, Вясна прыдзе, Сонца прыгрэе. Сонца прыгрэе. Ой, да ўжо згоніць, эх да, Ой, да ўжо згоніць Снежкі й мароз" [5, *406—407*]. Як бачна, сонца павінна перамагчы снег, мароз, а з імі і голад. "Вясна — голад", — гавораць сяляне, і цёплае лета з яго ўраджаем уяўлялася для іх недасягальным будучым: "Дзе галадна, там і холадна", і таму сяляне на заўвагу аб прыбліжэнні цёплага лета адказваюць: "Покуль лета прыйдзе, то холад вочы выесць" [6, *87*].

Аднак, нягледзячы на ўсялякія часовыя цяжкасці, напрадвесні, з надыходам першых сонечных ажыўляючых дзён змяняецца настрой і ў селяніна, адчуваецца праява нейкага першастваральнага асаблівага дачынення чалавека працы да макракосму. Гэта пацвярджаецца словамі наступнай песні: "Сонейка на прыпечак скацілася, І зямліца ўсміхнулася: — Вазьмі, сонейка, у бога дазволу І спусцісь да долу, Мы табе спяваем, Мы цябе ўсхваляем, Прыходзь, мы цябе чакаем" [5, *150*]. Такі своеасаблівы зварот маці-зямлі да вобраза сонца (а зямля, як бачна, абараняе інтарэсы людзей) з'яўляецца яскравым прыкладам адухаўлення чалавекам прыродных з'яў. Гэтую рысу старажытнага светапогляду М. Нікольскі характарызуе як антрапаморфны аніматызм, які заключаецца ў тым, што "першабытны чалавек лічыць, быццам усе акружаючыя яго з'явы прыроды, неадухаўлёныя прадметы, прадстаўнікі расліннага і жывёльнага свету, метэаралагічныя з'явы і г.д. жывуць такім жа жыццём, як і чалавек, з'яўляюцца такімі ж жадаючымі, адчуваючымі, змагаючыміся за сваё існаванне істотамі, як і чалавек працы" [8, *6*].

Невыключана, што менавіта таму ў шэрагу веснавых песень прасочваюцца даволі цікавыя паралелі паміж сонцам і, у некаторай ступені, сямейна-бытавымі адносінамі, асабліва тымі, якія датычацца жаночай палавіны: "Нізка, нізка сонца ходзіць, У маё ваконца не ўваходзіць. Блізка, блізка мой брат едзіць, Ка мне ў госці не заедзіць" [5, *437*]; "Ой, бацькава нега, Яна ў дзверы не лезе, А свёкрава слоўца, У аконца, як сонца, А свякровіны ўгрозы, Як лютыя марозы" [5, *444*]. Таксама ў песнях гэтага накірунку можна знайсці вясельныя матывы, неад'емнай рысай якіх з'яўляецца абавязковы зварот да архетыпа сонца: "...Ой ты, сонца, сонца краснае, Да чаму, сонца, за лес коцішся... Да чаму не жджэш пары летняе... Пары летняй, вясны краснае? Чаму, дзеўка, да ты замуж не йдзеш? Ужо ж ручнікі нагатовіла, Да й паном, сватом да й надавала" [5, *151*]; "Кукавала зязюлечка На захадзе сонца, Заплакала дзяўчынінка, Глядзела ў ваконца [5, *403*]. Зрэдку ў фальклоры зафіксавана нават тое, што вясну жартам лічылі "заступніцай удоў" [6, *87*].

На першым месцы ў веснавым цыкле знаходзіцца земляробчы культ. Сонца толькі дапамагала або запрашалася нашымі продкамі на дапамогу. Пацвярджэнне гэтаму можна знайсці і ў М. Нікольскага: "З чаканнем і з'яўленнем вясны звязваўся таксама цыкл разнастайных абрадаў, пераважна магічнага характару. Для земляроба важна, каб вясна не прыпазнілася, прыйшла своечасова; таму з пачатку цяперашняга сакавіка пачыналі "заклікаць" ці "гукаць" вясну, зваць яе" [8, *29—30*]. Надыход вясны суправаджаўся традыцыйнымі песнямі і абрадамі, якія

магічна нібыта заклікалі будучы ўраджай. Выконвалі шматлікія звароты да сонца. Здавалася, што яго нават вяскоўцы гатовы частаваць усялякімі паднашэннямі і ахвяраваннямі, каб толькі яно не адступілася, дапамагала ў далейшым, а ажыўляючыся, сілы свяціла рабілі сваю адвечную справу кожны дзень. Можна смела сцвярджаць, што звычай выпякаць вясной з цеста фігуркі жаўрукоў або буслоў і з'ядаць іх — ёсць не што іншае, як паўзабытая мадыфікацыя ахвярнай птушкі, якая, бясспрэчна, існавала ў старажытнасці і заключалася ў тым, што вясну у вобразе птушкі лавілі і прыносілі ў ахвяру богу сонца, а потым, з цягам стагоддзяў, і самому сонцу.

З пачаткам вясны звязваюцца рэдкія ў славян касмалагічныя павер'і аб штогадовым стварэнні Сусвету. Для міфалогіі ранневясенняга цыклу ў аднолькавай ступені значная і сімволіка пачатку, і сімволіка аднаўлення, якія не заўсёды нават можна правільна разлічыць, бо ўсё залежала ад "паводзін" сонца. З аднаўленнем жыцця і прыроды атрымлівалася, што нібыта аднаўлялася і сонца, яно быццам бы зноў нараджалася пасля зімовага "памірання".

З тэмай стварэння Сусвету, новага перыяду жыцця, магчыма, і звязана вядомая некаторым славянскім народам магічная працэдура: першага сакавіка (у першы дзень вясны і ў стары Новы год) жанчыны з самай раніцы, калі толькі ўзыходзіць адроджанае сонца, сучаць і прадуць шарсцяную нітку, якая павінна асацыіравацца з ніткай лёсу на пачатку жыцця чалавека. Гэтае кола вераванняў і магічных абрадаў знаходзіць месца і ў папулярным ва ўсходніх і заходніх славян звычаі падвешваць да столі плеценае саламянае ўпрыгожванне, якое называлі "павуком" (паколькі павук нібыта "свет снаваў") ці "кругам" (круг "сонца").

Самымі вялікімі гадавымі вясеннімі святамі былі Вялікдзень, Юр'я і Сёмуха. Яны адбівалі ў сабе пэўныя будзённыя этапы ў жыцці і працы селяніна-земляроба. Акрамя гэтых трох згаданых святаў, адзначалася яшчэ некалькі менш значных, якія таксама суправаджаліся адпаведнымі абрадамі, мелі свае звычаі, павер'і і выконвалі, паводле думкі земляроба, пэўныя традыцыйна-жыццёвыя функцыі.

Зразумела, што язычніцкае слова "Вялікдзень" — чыста народная агульнаславянская назва біблейскай "Пасхі". А. Багдановіч выказваў думку, што гэта святкаванне азначала "надыход вялікіх дзён панавання сонца і пачатку сезона палявой працы, дзён, якія прысвячаліся сонцу і іншым багам ратайства, уласцівасці якіх былі значна пазней перанесены на хрысціянскіх святых" [9, *107—108*]. Вядома, гэтае веснавое свята прыпадае на познюю вясну і расцягваецца на некаторы даволі працяглы адрэзак часу, аб'ядноўваючы вакол сябе цэлы святочны цыкл. У розных месцах славянскага рэгіёну сустракаюцца сведчанні аб тым, што на Пасху (Вялікдзень) сонца нерухома знаходзіцца на небе некаторы час. На Палессі лічылася, што на працягу некалькіх пасхальных дзён сонца застаецца на небе, таму Пасха быццам і называецца "Вялікдзень" — вялікі доўгі дзень. Існуе шэраг дзівосных з'яў, звязаных з сонцам. У адзін са святочных дзён (у тым ліку і на Пасху) сонца на ўсходзе (зрэдку — на захадзе) зіхаціць рознымі колерамі і рухаецца па небе тым ці іншым незвычайным чынам. "У адрозненне ад каляд і купалля вялікдзень не быў такі багаты на абрады, аграрную варажбу. Раніцай на першы дзень свята хадзілі сачыць "ігру сонца": назіралі за яго ўсходам з узгоркаў, стрэх, званіц. З'ўленне сонца на чыстым небе і "ігра" яго прадвяшчалі добрае, спрыяльнае для земляроба лета, багаты ўжон, шчаслівыя вяселлі" [10, *10*]. Павер'е аб "ігры сонца", вядомае па ўсей Еўропе, не заўсёды выказваецца ў форме развітага фальклорнага сюжэту (і таму, у прыватнасці, не фіксуецца паказальнікамі матываў). Напрыклад, ва ўсходнеславянскай традыцыі звычайным з'ўляецца толькі прыгадванне аб гэтай з'яве, перададзенае з дапамогай характэрных дзеясловаў, часта карэліруючых з назвай каляндарнага свята ці з яго сімвалічным значэннем. Напрыклад, на Купалу сонца часта *купаецца* (некалькі разоў апускаецца і падымаецца), на Узвіжанне — *зрушваецца*, а на Пасху — ***радуецца***, што адпавядае міфапаэтычнаму канцэпту Уваскрэсення Хрыс-

това; сонца таксама *гуляе, дрыжыць, весяліцца, кланяецца, красуецца, цвіце, зіхаціць, ходзіць, бегае, танцуе, прыгае, кружыцца, да вянца ідзе, жэніцца...*" [3, *527*].

Адметнай рысай велікоднага абраду было хаджэнне валачобнікаў. Яны ўсіх віталі старасвецкай велікоднай песняй, жадалі гаспадару і ўсім членам яго сям'і добрай долі, здароўя, спору на ніве і ў хаце. Абавязкова згадвалі і "яснае сонейка".

Беларускія валачобныя песні амаль не маюць у культурах суседніх народаў аналагаў. Свет земляроба, яго жыццё ў валачобных песнях паўстаюць у шырокім вымярэнні, адчуваецца, што чалавек працы пастаянна знаходзіўся нібы ў самым цэнтры Сусвету, а знаходжанне гэтае размяркоўвалася па сонечнай часавай традыцыі.

"Вялікаднямі" пачынаецца земляробчы год, — падкрэслівае А.Багдановіч, — і песні вялікодныя амаль цалкам прысвечаны ўсхваленню земляробчай працы... Нідзе ў беларускіх песнях не адводзіцца настолькі пачэснага месца земляробчай працы, як у валачобных, і гэта, у сувязі з той акалічнасцю, што ў іх амаль не закранаецца хрысціянскае значэнне Пасхі, на нашу думку, паказвае, што гэтыя песні некалі адносіліся да свята нехрысціянскага паходжання" [9, *106—107*]. Як бачна, Вялікдзень — гэта вялікае свята канчатковай перамогі дабра і хараства над злом, стужай і пакутамі, бога-сонца над благім богам цемры і холаду. Згадаем тут і язычніцкую легенду пра перамогу сілаў Белабога над Чарнабогам. Таму ў валачобных песнях усхваляецца будучы ўраджай, звязаныя з ім палявыя работы і сонца, ад якога залежыць жыццё і дабрабыт людзей, вынікі земляробства. Веліч ідэалізаванага, уяўнага малюнку прыроды і будучага жадаемага ўраджаю перададзены ў наступных радках: "Ва нядзельку паранюсенька ўзышло сонца весялюсенька, узышло яно абутрала, Асвяціла лугі, бары, Лугі, бары, чыстае поле, Чыстае поле, жыта ядраное" [5, *83*].

Эманацыя сонечнага святла станоўча ўплывае на рост раслін, на будучы ўраджай, таму назіраецца параўнанне з металамі (золатам і срэбрам), што сімвалізуюць сонца: "У коласе, як у золаце, У корані, як у чыстым срэбры" [5, *106*]. У валачобных песнях ушаноўвасцца не толькі сонца, якое ўзышло, але і гучыць матыў велічання гаспадара, як ў калядках са шчадроўкамі. І тут таксама прасочваецца сонечная сімволіка золата: "У нашага арандара залатая камора, У той каморы тры аконцы. На адном аконцы харошыя кветкі, ў другом аконцы ясны месяц, ў трэйце аконца свеціць ясна сонца... ясны месяц — пан арандар, яснае сонца — жонка яго, харошыя кветкі — то яго дзеткі" [5, *237*]. Такім шляхам жаданыя госці-валачобнікі імкнуліся ўзвялічыць годнасць гаспадара, чалавека працы, шчырага душою і сумленнага ў адносінах да людзей. Выкарыстоўвалі пры гэтым такія своеасаблівыя паралелі з залатакосым сонцам і з самім золатам.

Такім чынам, "рэалізаваная ў валачобнай творчасці сацыяльна-гуманістычная канцэпцыя ўключае меркаванні продкаў пра шчаслівае, годнае чалавека-земляроба жыццё..." [8, *206*], а адбітак салярнага культу ў светапоглядзе вечнага працаўніка ўзмацняе гэты гуманістычны пачатак уяўленнямі аб сонцы як трыадзінай крыніцы жыцця, ураджаю і дабрабыту і, дапасаваўшыся да земляробчага культу, дапаўняе старажытныя ўяўленні аб навакольным свеце, прадметы і з'явы якога ўспрымаюцца па аналогіі з жыццём чалавека.

**Літаратура**

1. Белорусы. М., 1998.
2. *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. К., 1887. Вып. 3.
3. *Агапкина Т.А.* Мифологические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл. М., 2002.
4. *Карскі Я.* Беларусы. Мн., 2001.
5. Валачобныя песні. Мн., 1980.
6. *Крачковский Ю.Ф.* Быт западнорусского селянина. М., 1874.
7. *Гілевіч Н.* Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Мн., 1975.
8. *Никольский Н.М.* Дохристианские верования и культы днепровских славян. М., 1929.
9. *Багдановіч А.Я.* Перажыткі старажытнага светасузірання беларусаў. Мн., 1995.
10. *Ліс А.С.* Валачобныя песні. Мн., 1989.